# Беларуская мова: рыхтуем да ЦТ

**Н. М. Зяткіна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 19 г. Магілёва

*Скажы мне – я забываю.*
*Пакажы мне – я магу запомніць.*
*Дазволь мне зрабіць гэта – і гэта стане маім назаўсёды.*
*Кітайская прыказка*

Экзамен у форме тэсту патрабуе ад вучняў кампетэнтнасці як у сферы ведаў і ўменняў па прадмеце, так і ў сферы самакантролю, самарэгуляцыі псіхічнага стану. Хто як не настаўнік дапаможа вучню абагуліць і сістэматызаваць веды па прадмеце, сфарміраваць навык выканання тэставых заданняў, настроіцца на поспех?

Настаўнік пры падрыхтоўтоўцы вучняў да ЦТ садзейнічае сістэматызацыі і паглыбленню ведаў па ўсіх раздзелах курса беларускай мовы, стварае ўмовы для развіцця маўлення, для пашырэння слоўнікавага запасу, фарміруе навыкі выканання тэставых заданняў, спрыяе выхаванню станоўчых адносін да навучальнага працэсу.

Звычайна ў творчай лабараторыі настаўніка ёсць тэсты па ўсіх тэмах, зборнікі ЦТ папярэдніх гадоў, абавязкова – камп'ютарныя трэнажоры. Дальнабачны настаўнік пачынае выкарыстоўваць тэсты ў якасці формы кантролю ведаў ужо ў 5 класе. Таксама ён выкарыстоўвае тэсты не толькі для кантролю ведаў, але і пры тлумачэнні або замацаванні вучэбнага матэрыялу, пры выкананні дамашняга задання. Настаўнік умела арганізуе паўтарэнне вучнямі раней вывучанага матэрыялу, бо пры паўтарэнні ўзнікае ўпэўненасць у сваіх ведах. Разгледзім найбольш эфектыўныя метады і сродкі навучання вучняў пры падрыхтоўцы да ЦТ на асноўных этапах урока.

Этап праверкі дамашняга задання:

1. Тлумачэнне лінгвістычных тэрмінаў, запісаных на дошцы: *агульны назоўнік, асабовы назоўнік, абстрактны назоўнік (6 клас); дапасаванне, прымыканне, кіраванне (8 клас).*
2. Складанне міні-віктарыны па правіле.
3. Складанне слоўнікавага дыктанта па правіле.
4. Выкананне тэставага задання, запісанага на дошцы: А*дзначце словы, якія ў месным склоне адз. ліку маюць канчатак -ы: а) шчака; б) кветка; в) афіша; г) нара; д) мяжа.*

Этап актуалізацыі ведаў:

1. Арфаграфічныя хвілінкі на паўтарэнне аднаго або некалькіх правілаў.
2. Творчае спісванне : *л…пух, р…знае, ч…рствы, ш…снаццаць, аранж…рэя.*
3. Акцэнталагічныя хвілінкі: *фартух, садавіна, навіна, крапіва, вусы, спіна.*
4. Лінгвістычныя загадкі: *чаму светлавалосы пішацца разам, а светла-карычневы праз злучок?*
5. Сінтаксічны разбор сказаў: *Зіма была снежная.*

Этап тлумачэння новага матэрыялу:

1. Састаўленне апорнага канспекта.
2. Прапанаванне падказак для запамінання правіла.
3. Праблемнае пытанне: *чым адрозніваецца сонечны прамень ад сонечнага настрою?*
4. Уступнае тэставае заданне.
5. Пераклад з рускай мовы на беларускую: *раздолье, ночью, судья, жильё, пицца, суббота, саванна.*
6. Тлумачэне некаторых моўных закамернасцей: *правапіс не (ня) з дзеясловам, з дзеепрыслоўем; утварэнне ступеней параўнання прыметнікаў, прыслоўяў.*

Этап замацавання новага матэрыялу:

1. Абагульняючыя практыкаванні: знайсці трэцяе лішняе, скласці свой рад прыкладаў, размеркаваць словы па групах.
2. Тэставыя заданні закрытага тыпу: выбраць правільнае сцверджанне, выбраць правільныя варыянты адказу.
3. Тэставыя заданні адкрытага тыпу: завяршыць фармуліроўку, аднавіць нехапаючае звяно ланцужка, запісаць адказ на пытанне.
4. Прыцягненне вучняў да самастойнага састаўлення тэставых заданняў, да пастаноўкі пытанняў па матэрыяле падручніка з пазіцыі ЦТ.

Этап выканання дамашняга задання:
1. Паўтарыць раней вывучанае правіла.
2. У тэксце практыкавання вызначыць тып, стыль тэксту, сродкі сувязі і від сувязі сказаў.
3. Выканаць фанетычны, марфемны, словаўтваральны, марфалагічны або сінтаксічны разбор.
4. Напісаць міні-сачыненне ў пэўным стылі маўлення.

Найбольш плённымі і накіраванымі на паспяховы вынік з’яўляюцца заняткі гуртка па падрыхтоўцы вучняў да цэнтралізаванага тэсціравання. У час працы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя метады і прыёмы навучання:
1. Выкарыстанне магчымасцей кабінета інфарматыкі, выкананне тэстаў на камп’ютары.
2. Вядзенне апорных канспектаў.
3. Абавязковае паўтарэнне раней вывучанага ў форме 1-2 тэставых заданняў.
4. Аналіз тыповых памылак, дапушчаных на тэсціраванні абітурыентамі папярэдніх гадоў.
5. Строгі падыход да праверкі тэстаў (напрыклад, не залічваць адказ тыпу В, калі словы напісаны з памылкай).
6. Залік (без папярэджання) па тэрмінах, па тэарэтычным матэрыяле.
7. Арганізацыя самаправеркі і ўзаемаправеркі.
8. Правядзенне трэнінгу “Здаём ЦТ”.

9. Вядзенне карт вучэбных дасягненняў вучняў, улік прабелаў у ведах, зварот да раней дапушчаных памылак.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на тое, што заданні на адно і тое ж правіла могуць утрымліваць розную фармуліроўку: *адзначце сінтаксічныя канструкцыі, у якіх* ***не*** *са словамі пішацца асобна; адзначце сінтаксічныя канструкцыі, у якіх* ***не (ня)*** *са словамі пішацца разам.*

Добра, калі пры падрыхтоўцы да тэсціравання будуць выкарыстоўвацца і тэставыя заданні “з пасткамі”: *Адзначце прыметнікі, формы ступеней параўнання якіх утвораны правільна: а) самы найраднейшы; б) большы; в) менш гасцінна; г) багацейшы.*

Абавязковым будзе зварот да тыповых памылак на тэсціраванні, якія дапускаюць абітурыенты пад уплывам рускай мовы, з-за недастатковага валодання тэрміналогіяй, несфарміраванасці аналітычных уменняў. Нельга забываць, што абітурыенты даволі часта адчуваюць цяжкасці пры вызначэнні часцінамоўнай прыналежнасці слоў (*<u>пасля</u> працы – <u>пасля</u> затанцавалі*), пры вызначэнні сінтаксічнай функцыі той ці іншай часціны мовы (*<u>Ісці</u> было прыемна, лёгка. Сцёпка прыбег да фінішу <u>трэцім</u>*).

Настаўнік улічвае і псіхалагічныя аспекты падрыхтоўкі вучняў да ЦТ. Садзейнічае развіццю ў вучняў адэкватнай самаацэнкі шляхам арганізацыі самаправеркі тэставых заданняў, пісьмовых адказаў на пытанні, самаацэньвання. Дапамае вучням у развіцці пазнавальных працэсаў – мыслення, увагі, памяці.

Абавязковым у падрыхтоўцы да ЦТ з’яўляецца развіццё наступных уменняў:

- ✓ Уменне валодаць сабой і адэкватна рэагаваць на фактары, якія адцягваюць увагу (на кантрольнай рабоце можна ўключыць радыё).
- ✓ Уменне самастойна кантраляваць час (інфармаваць пра час, адведзены на выкананне задання, не даваць лішняга часу).
- ✓ Уменне рабіць свядомы выбар (практыкаваць на ўроках выбар узроўню складанасці задання, таварыша для работы ў пары, формы прад’яўлення выніку работы).

- ✓ Уменне мабілізаваць сябе на працу (правільнае дыханне, самамасаж, аўтатрэнінг, практыкаванні для зняцця мышачнага напружання).

Парады настаўніку пры падрыхтоўцы вучняў да ЦТ

1. Стварайце ўмовы для развіцця маўлення вучняў, для пашырэння слоўнікавага запасу.
2. Фарміруйце ўпэўненасць, што мова – гэта сістэма, што ўсе раздзелы мовазнаўства ўзаемазвязаны.
3. Патрабуйце ад вучняў правільнай фармулёўкі адказу на пытанне, грунтоўнага валодання тэрміналогіяй.
4. Пры выкананні тэставых заданняў стварайце ў класе ўмовы, блізкія да тых, што будуць пры здачы ЦТ.
5. Састаўляйце самі тэставыя заданні з улікам тыповых памылак вашых вучняў.
6. Стварайце сітуацыю поспеху.
7. Настрайвайце сябе на тое, што вашы вучні разумныя, добра падрыхтаваныя і вельмі творчыя, таму што вы самі добра падрыхтаваны спецыяліст і творчы педагог.